ЛИГА ЗНАТОКОВ
УЧИСЬ. ИГРАЙ. ПОБЕЖДАЙ.

Зацверджаны
05 лютага 2026 г.
ТАА «Лига Знатоков»

**Правілы анлайн-турніру «Роднае Слова»**

1. Дадзеныя правілы рэгламентуюць парадак правядзення і ўдзелу ў анлайн-турніры «Роднае Слова» (далей – Турнір).
2. Арганізатарам Турніра з'яўляецца Таварыства з абмежаванай адказнасцю «Лига Знатоков» (далей – Арганізатар).
3. Да ўдзелу ў Турніры дапускаюцца вучні I–XI класаў (далей – Удзельнікі), якія прайшлі рэгістрацыю ў асабістым кабінеце на афіцыйным сайце «Лига Знатоков» па адрасе https://liga-znatokov.by (далей – Платформа).

**Парадак правядзення і тэрміны:**

4. Анлайн-турнір **«Роднае Слова»** праводзіцца ў дыстанцыйным фармаце, заданні анлайн-турніру будуць даступныя для выканання **з 27 па 28 лютага 2026 года з 09:00 да 21:00 (па мінскім часе)**. Для ўдзелу ў Турніры Удзельніку неабходна мець асабісты кабінет на сайце https://liga-znatokov.by і набыць турнірны жэтон. Калі асабісты кабінет быў створаны раней, паўторная рэгістрацыя не патрабуецца. На выкананне заданняў адводзіцца 60 хвілін. Каб прыступіць да праходжання, трэба націснуць кнопку «**Участвовать**», даступную на галоўнай старонцы або ў асабістым кабінеце ў дзень правядзення анлайн-турніру. Сістэма аўтаматычна спіша за запуск спробы адзін жэтон, пасля чаго Удзельніку будзе дадзены доступ да турнірных заданняў і пачнецца адлік часу, адведзенага на іх выкананне.
5. Удзельніку прапануецца для рашэння 20 задач, якія дыферэнцыраваны па ўзроўню складанасці.

**Налічэнне балаў:**

6. Кожная турнірная задача ў залежнасці ад узроўню складанасці ацэньваецца пэўнай колькасцю балаў. Дадзеная інфармацыя адлюстроўваецца Удзельніку пры атрыманні задання.
7. За правільны адказ, афармлены ў адпаведнасці з патрабаваннямі да формы (гл. умову задачы), Удзельніку налічваюцца ўказаныя балы.
8. У выпадку ўказання няправільнага адказу або прадстаўлення правільнага адказу, але які не адпавядае фармату ўмовы, адказ не залічваецца, а колькасць балаў застаецца нязменнай.
9. Сістэма аўтаматычна правярае і ўлічвае арфаграфічныя памылкі пры ацэнцы вашых адказаў.

**Умовы ўдзелу і аплаты:**

10. Для аплаты ўдзелу ў Турніры выкарыстоўваецца ўнутраная разліковая адзінка – «ЖЭТОН». Адзін жэтон дае права на адзін удзел у Турніры.
11. У кожнага Удзельніка ёсць унутраны рахунак — «КАШАЛЁК», на які залічваюцца жэтоны.
12. Кошт аднаго жэтона складае **5,00** беларускіх рублёў.

**Парадак аплаты ўдзелу:**

- для Удзельнікаў з Рэспублікі Беларусь аплата за ўдзел у анлайн-турніры прымаецца праз сістэму ЕРИП ці E-POS, а таксама магчыма правесці аплату анлайн-картамі праз іншыя арганізацыі інтэрнэт-эквайрынгу.
- доступ да ўдзелу ў Турніры прадастаўляецца толькі пасля атрымання Арганізатарам пацверджання аб паспяховай аплаце.

**Вызначэнне вынікаў і турнірная табліца:**

13. Удзельнікі спаборнічаюць унутры сваіх паралеляў. Палажэнне ў турнірнай табліцы вызначаецца колькасцю набраных балаў і адлюстроўваецца асобна для кожнага класа.
14. У выпадку роўнасці балаў больш высокае месца прысуджаецца Удзельніку, які паказаў лепшы вынік па дадатковым крытэрыі – найменшым часе, затрачаным на выкананне заданняў. Улік часу вядзецца з дакладнасцю да секунды.

**Узнагароджанне і прызы:**

15. Удзельнікі, якія занялі 1, 2 і 3 месца, маюць права абмяняць назапашаныя балы на прызы і ўзнагароджваюцца дыпломам; усе астатнія Удзельнікі атрымліваюць электронны сертыфікат, даступны для спампоўвання ў асабістым кабінеце. Дыпломы і сертыфікаты

размяшчаюцца ў раздзеле «История турниров» і прадастаўляюцца праз кнопку «Мои достижения», пасля завяршэння апеляцыйнага перыяду.

16. Канчатковыя вынікі Турніру стануць вядомы **05 сакавіка** 2026 года, пасля завяршэння апеляцыйнага перыяду.

17. Прызы можна выбраць у спецыяльным раздзеле Платформы «Лавка Призов», якая адкрыецца **06 сакавіка** 2026 года ў 12:00 па мінскім часе. Абмяняць балы на прызы можна будзе да **16 сакавіка** 2026 года.

18. Неактыўная кнопка «Выбрать приз» азначае, што Удзельнік не ўвайшоў у лік прызёраў (не заняў 1, 2 ці 3 месца).

**Рэгламент правядзення Турніра:**

19. У перыяд выканання заданняў катэгарычна забараняецца:
• карыстацца падказкамі трэціх асоб;
• выкарыстоўваць пошукавыя сістэмы, інструменты ШІ, вучэбную літаратуру і іншыя знешнія крыніцы;
• выводзіць старонку з заданнем з фокусу (пераключаць укладкі, згортваць акно, адкрываць іншыя праграмы, блакіраваць экран мабільнай прылады, выключаць ці перазагружаць прыладу і інш.);
• прымяняць тэхнічныя сродкі для атрымання перавагі, не прадугледжанай правіламі;
• прымаць званкі, а таксама выкарыстоўваць прыладу, з якой вы ўдзельнічаеце ў Турніры, для іншых мэт.

20. Платформа аўтаматычна фіксуе пераключэнне на іншыя ўкладкі браўзэра або праграмы. У гэтым выпадку бягучая задача анулюецца і залічваецца як выкананая няправільна, а Удзельнік, калі сістэма дапушчае гэта, працягвае працу з наступнымі заданнямі. Паступленне і адказ на званок, а таксама іншыя аналагічныя дзеянні таксама расцэньваюцца сістэмай як парушэнне.

21. Пасля пачатку выканання заданняў адлік часу працягваецца, нават калі старонка была закрыта або абноўлена.

22. У выпадку выяўлення парушэння п.20. магчымыя меры: часовае блакіраванне асабістага кабінета на час Турніру, дыскваліфікацыя і ануляванне вынікаў. Паўторныя або наўмысныя парушэнні прыводзяць да больш жорсткіх санкцый, аж да поўнага спынення доступу да Турніру.

23. Рашэнні аб прымяненні санкцый прымаюцца адміністрацыяй Платформы на падставе даных аўтаматычнага кантролю і, пры неабходнасці, дадатковай ручной праверкі.

**Тэхнічныя патрабаванні:**

22. Каб пазбегнуць канфлікту праграмнага забеспячэння і блакіроўкі доступу да турнірных заданняў, неабходна, перад пачаткам удзелу ў Турніры, часова прыпыніць працу антывірусаў.

**Для компьютеров/ноутбуков (минимальные требования):**
ОС: Windows 7+, macOS 10.15+, Linux (Ubuntu 18.04+) и выше;
Браузер: Chrome 90+, Firefox 88+, Safari 14+, Edge 90+, Opera 76+, Яндекс.Браузер 21+;
Интернет: Стабильное соединение от 1 Мбит/с;
Экран: Минимум 1024x768 пикселей;
JavaScript: Обязательно включен;
Cookies: Обязательно разрешены.

**Для мобильных устройств (минимальные требования):**
ОС: iOS 12+, Android 8.0+ и выше;
Браузер: Safari (iOS), Chrome/Opera/Яндекс.Браузер (Android)
Экран: Минимум 320px ширина;
Интернет: Стабильное соединение от 1 Мбит/с.

**Звяртаем увагу**: для ўдзелу ў Турніры з выкарыстаннем мабільных прылад неабходна:
• адключыць аўтаматычную блакіроўку экрана;
• актывізіраваць рэжым «Не беспокоить».